# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
24 снежня
1993 года
№ 18 (1705)


# З НОВЫМ ГОДАМ!



# АБ'ЯЎЛЯЕЦЦА КОНКУРС

**Трансфармацыя гуманітарнай адукацыі на Беларусі —** так называецца адкрыты конкурс, у якім могуць браць удзел настаўнікі, выкладчыкі, вучоныя акадэмічных і галіновых навуковых устаноў і арганізацый Беларусі і краін замежжа.

**Конкурс праводзіцца ў тры туры.**

Скарыстоўваецца сістэма грантаў. Работа усіх аўтараў, якія прайшлі кожны тур, аплачваецца. Адкрыты конкурс праводзіцца Міністэрствам адукацыі Беларусі (Мінск) з удзелам Фонда Сораса — Беларусь.

Мэтаю конкурса з'яўляецца абнаўленне сістэмы адукацыі Беларусі. стрварэнне комплекса навучальных дапаможнікаў, хрэстаматый, даведнікаў, слоўнікаў, практыкумаў, сродкаў навучання, з арыентаваных на карыстанне камп'ютэрнай і аўдыёвізуальнай тэхнікай для вышэйшай і сярэдняй школы па гуманітарных і сацыяльна-эканамічных дысцыплінах.

Конкурс праводзіцца па наступных напрамках:

**філасофія, сацыялогія, эканоміка, паліталогія, правазнаўства, сацыяльная работа, псіхалогія і педагогіка, культуралогія, сусветная і беларуская літаратура, белеруская мова, гісторыя Беларусі, нацыянальная культура, экалогія, чалавек і грамадства, гісторыя мастацтва, дашкольная адукацыя, пачатковая школа, стваральная тэхналогія, геаграфія.**

У конкурсе могуць браць удзел як асобныя аўтары, так і аўтарскія калектывы вузаў і пачатковых устаноў Беларусі, а таксама замежныя аўтары з краін СНД і іншых дзяржаў. Арганізатары конкурса маюць намер адабраць па кожнаму віду дапаможнікаў вучэбна-метадычнага комплекса не па адной, а па некалькі конкурсных работ, каб забяспечыць альтэрнатыўнасць і варыянтнасць выкладання дысцыплін.

Конкурс ананімны, у сувязі з чым работы на конкурс павінны быць прадстаўлены пад дэвізам.

Праводзіцца:

1. Конкурс заявачных матэрыялаў;
2. Конкурс рукапісаў;
3. Публікацыя конкурсных работ.

**Тэрмін конкурса адзін год, пачынаючы з 1 студзеня 1994 года.**

Аўтары, якія паспяхова пройдуць першы тур, атрымаюць грант на працяг працы.

Установам кампенсуюцца магчымыя выдаткі, звязаныя з часовым вызваленнем ад асноўнай працы аўтараў, што атрымалі грант на конкурсе.

Пасля другога тура канчаткова падрыхтаваныя рукапісы, што пройдуць экспертызу конкурсных камісій, будуць выдадзены пробным тыражом і накіраваны для апрабавання ў вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы Беларусі.

Усе аўтарскія правы зберагаюцца за аўтарам работы.

Надалей прадугледжваецца тыражырванне лепшых работ на падставе заявак, што прыйдуць ад вузаў, школ і іншых навучальных устаноў. Усё гэта будзе спрыяць стварэнню рынка адукацыйных паслуг і канкурэнцыі адукацыйнай прадукцыі.

Арганізацыяй, якая ажыццяўляе каардынацыйна-метадычную работу, з'яўляецца Выканаўчая дырэкцыя праграмы «Трансфармацыя гуманітарнай адукацыі на Беларусі». На яе адрас з паметкай «На конкурс» накіроўваюцца ўсе матэрыялы ад аўтараў.

Адрас:220027, Мінск-27, пр. Ф. Скарыны 65, Політэхнічная Акадэмія, корпус II А, пакой 503 «Фонд Сораса — Беларусь», тэл.факс: 32-77-13.

ПАЛАЖЭННЕ

аб умовах правядзення конкурса падручнікаў, вучэбных матэрыялаў і метадычнага забеспячэння па гуманітарнай адукацыі для навучальна-выхаваўчых устаноў Беларусі

1. Конкурс аб'яўляецца і праводзіцца Міністэрствам адукацыі сумесна з Фондам Сораса — Беларусь.

2. Мэтаю конкурса з'яўляецца абнаўленне сістэмы гуманітарнай адукацыі Беларусі, стварэнне новых падручнікаў, навучальных дапаможнікаў і фарміраванне рынка разнастайнай навучальнай прадукцыі ў галіне гуманітарнай адукацыі.

3. Конкурс з'яўляецца адкрытым, у ім бяруць удзел беларускія і замежныя аўтары, міжнародныя аўтарскія калектывы вучоных, метадыстаў, настаўнікаў.

4. На конкурс прымаюцца рукапісы падручнікаў, навучальна-метадычных камплектаў, дапаможнікаў для настаўнікаў і выкладчыкаў дашкольных ўстаноў, агульнаадукацыйных школ, педагагічных вучылішч і вузаў не толькі па традыцыйных прадметах, але і па тых, якіх няма ў навучальных планах.

Тэматычныя рамкі конкурса вельмі шырокія — будуць разглядацца любыя работы, якія можна скарыстаць для паляпшэння выкладання гуманітарных прадметаў у школах і педвузах, гуманізацыі прадметаў прыродазнаўча-матэматычнага цыкла, а таксама ўвядзення новых навучальных прадметаў, звязаных з такімі галінамі, як **«Веды», «Асоба», «Грамадства», «Культура», «Духоўнасць», «Пазнанне».**

5. Тэрмін падачы заяўкі аб удзеле ў конкурсе заканчваецца 16 красавіка 1994 года і вызначаецца па пачтоваму штэмпелю.

**Усе заявачныя матэрыялы прадстаўляюцца ў 3-х экзэмплярах.**

6. Аб'ём заяўкі не павянен перавышаць чатырох старонак машынапіснага тэксту, дзе неабходна прадугледзець:

— назву будучага навучальнага дапаможніка і яго магчымы аб'ём,

— праблемную галіну і навучальны прадмет,

— канкрэтную ўзроставую групу і тып навучальна-выхаваўчай установы, на якую разлічана ваша праца,

— асноўныя вытокі напісання дапаможніка.

Разам з заяўкай павінны быць прадстаўлены:

1. Анатацыя — 1 старонка.

2). Абгрунтаванне актуальнасці будучага навучальнага дапаможніка (1 старонка).

3). Пашыраны план-канспект рукапісу (0,5—1 старонка).

4). Адна-дзве пробныя главы (не больш за дзве друкаваныя старонкі).

5). Звесткі аб аўтарах (хатні адрас, месца працы, узрост, нумары службовага і хатняга тэлефонаў, накірунак навучальных даследвання) **размяшчаюцца на асобным лісце.**

6). Кожны заявачны матэрыял, у тым ліку і звесткі аб аўтары, суправаджаюцца дэвізам.

7). Тэрмін падачы матэрыяла на конкурс: 1-ы тур — 16 красавіка 1994 года, 2-і тур — 14 чэрвеня 1994 года, 3-і тур — 7 сакавіка 1995 года.

Да моманту заканчэння кожнага тура конкурсная камісія выносіць рашэнне па яго выніках і даводзіць іх да ўсіх удзельнікаў конкурса.

Грант першага тура прадстаўляецца на 4 месяцы. Грант другога тура прадстаўляецца на 6 месяцаў.

8. Вынікам першага і другога тураў конкурса з'яўляецца прысуджэнне конкурснай камісіяй грантаў, вынікам трэцяга тура — публікацыя пробным тыражом (да трох тысяч экзэмпляраў), а для лепшых рукапісаў — рэкамендацыя да выдання масавым тыражом з грыфам Міністэрства адукацыі Беларусі.

9. Памер гранта вызначаецца ў кожным выпадку індывідуальна, падчас гутаркі з удзелам прадстаўнікоў Фонда Сораса — Беларусь і складае ў сярэднім 20 мінімальных заработных плат штомесячна з улікам інфляцыі.

ВІНШУЕМ!

## КАЛІ ТАКІЯ ЛЮДЗІ НА БЕЛАРУСІ ЁСЦЬ

Пакуль медыкі спрачаюцца пра ўздзеянне спорту на арганізм жанчыны, апошнія даказваюць сваю неперамажнасць не толькі на кухні, але і ў заведама мужчынскім занятку — кікбоксінгу.

На сусветных спаборніцтвах па гэтаму віду спорта сярод жанчын, што праходзіў не так даўно ў Злучаных Штатах Амерыкі, адно з прызавых месцаў заняла прадстаўніца Беларусі. Наталля Бердзяева вучыцца на першым курсе юрыдычнага факультэта, аддзяленне — міжнароднае права.

Юрась КАРМАНАЎ.

## НОВЫЯ ПРЭМІІ АД БДУ

**У гэтым годзе рашэннем навуковага Савета БДУ былі прызначаны дзве прэміі. Прэміяй імя Сеўчанкі — былога рэктара БДУ — узнагароджваецца навуковец, які ўнёс значны ўклад у навуковыя распрацоўкі прыродазнаўчай сферы. Другой прэміяй імя Пічэты (першага рэктара БДУ) — за ўклад у развіццё гуманітарнай навукі.**

**Лаўрэатам прэміі імя Сеўчанкі стаў загадчык кафедрай заалогіі біялагічнага факультэта прафесар І. К. Лапацін. У дыпломе, які быў выдадзены прафесару Лапаціну, запісана: «...За стварэнне новага накірунку ў вывучэнні энтамафаўны Беларусі».**

**Лаўрэатам прэміі імя Пічэты стаў загадчык кафедрай новай і навейшай гісторыі гістарычнага факультэта прафесар У. С. Кошалеў. Ён атрымаў прэмію за навуковую працу па вывучэнню гісторыі Егіпту. У сваёй рабоце ён разгледзеў і даследаваў пытанні генэзісу партыйнай сістэмы, фарміравання палітычных структур, мадэрнізацыі, праблему антыбрытанскага падполля, ісламскі фундаменталізм і яго вытокі і інш.**

**Гутарку з лаўрэатамі чытайце на другой старонцы.**

## І НА СВЕТ ПАГЛЯДЗЕЦЬ, І СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ

**Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязяй з замежнымі краінамі сумесна з амерыканскай грамадскай арганізацыяй «Фрэндшып — Форс» арганізавала паездку Дзяржаўнага ансамбля танца па Злучаным Штатам Амерыкі. У ансамбль уваходзяць і студэнты БДУ. Гастролі доўжыліся да сярэдзіны снежня ў штаце Менісота. Прадугледжвалася правядзенне некалькіх дабрачынных канцэртаў, зборы ад якіх пайшлі ў фонд дапамогі пацярпеўшым на Чарнобыльскай аварыі.**

## СВЯТКАВАННІ ЎГОДАК Я. ЦІКОЦКАГА

**Як паведамілі карэспандэнту «Беларускага універсітэта», 8 снежня ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы прайшоў творчы вечар, які быў прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага кампазітара Я. Цікоцкага.**

**На сустрэчы, акрамя гасцей, прысутнічаў сын Я. Цікоцкага, прафесар, што зараз выкладае ў нашым універсітэце на факультэце журналістыкі. Міхал Яўгенавіч падзякаваў гасцям за добрыя словы, што гучалі ў адрас бацькі.**

НУ І НУ!

## ВЕК ЖЫВІ, ВЕК ВУЧЫСЯ. У БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ

***Як стала вядома карэспандэнту «Беларускага універсітата», у нашым універсітэце на дзённым аддзяленні вучыцца студэнт, якому споўнілася ўжо 56 гадоў.***

***Ахвотны да ведаў студэнт вучыцца на геаграфічным факультэце. Прозвішча яго нам высветліць не ўдалося, але вядома, што прыехаў ён да нас з краін далёкага замежжа.***

# У ТЫМ, ШТО БЕЛАРУСКІЯ ЭНТАМОЛАГІ ПРАЦУЮЦЬ НА ЕЎРАПЕЙСКІМ УЗРОЎНІ, ВЯЛІКАЯ ЗАСЛУГА ПРАФЕСАРА ЛАПАЦІНА

***Лаўратам прэміі імя Сеўчанкі за навуковыя дасягненні ў прыродазнаўчай сферы стаў прафесар І. К. Лапацін, які кіруе сёння кафедрай заалогіі біялагічнага факультэта БДУ.***



**— Ігар Канстанцінавіч, хто вылучыў вас на саісканне прэміі і за што вы яе атрымалі?**

— Кожны факультэт вылучаў сваіх кандыдатаў на саісканне прэмій, якія прысуджаюцца ўпершыню ў гэтым годзе. Маю кандыдатуру вылучыў біялагічны факультэт. У выніку абмеркавання, рэцэнзавання, вывучэння маёй навуковай работы было прынята рашэнне аб прысуджэнні прэміі менавіта мне. Падмуркам для такога рашэння сталі мае працы па энтамалогіі, у якіх прадметам вывучэння з'яўляюцца насякомыя. У дыпломе аб прысуджэнні прэміі сказана: «...за стварэнне новага накірунку ў вывучэнні энтамафауны Беларусі». Насякомыя — самая вялікая група жывых істот на планеце. Навукоўцамі апісваецца звыш 1,5 мільёна відаў жывёл. Міл'ён з іх — насякомыя. Адсюль важнасць гэтай групы. Сярод іх шмат карысных відаў, якія, скажам. апыляюць расліны, выкарыстоўваюцца для біялагічнай аховы ўраджаяў і г.д. Але ж сярод насякомых шмат шкодных — каларацкі жук, напрыклад. Раслінаяднымі насякомымі я і займаюся на працягу дзесяткаў гадоў. Каля мяне ляжаць мае кнігі — прадмет майго гонару. Тут ёсць і манаграфіі на англійскай мове, два падручнікі і інш. За ўсю гэтую велізарную працу я атрымаў прэмію імя А. Н. Сеўчанкі.

**— Крыху банальна гучыць, але прырода — наш дом. Знікненне аднаго віда ў ім — катастрофа. Што робіцца для ўсведамлення гэтай ісціны ў беларускай навуцы?**

— Зараз вельмі шмат гаворыцца аб неабходнасці вывучэння і захавання біялагічнай разнастайнасці нашай планеты. Усе біялагічныя працэсы на планеце працякаюць больш хутка і больш паспяхова, калі ў іх удзельнічае многа кампанентаў. Знікненне любога віду прывядзе да таго, што працэсы гэтыя будуць запаволены, а, магчыма, і не спрацуюць. Мы займаемся вывучэннем кампанента біясферы, які ўяўляе сабой арганізм насякомых. Да даволі позняга часу — Беларусь у гэтых адносінах вельмі спазнілася — нашай навуцы не былі вядомы ўсе віды насякомых. Сёння мы пачынаем устанаўліваць відавы склад Беларусі. Гэта своеасаблівая інвентарызацыя, падлік таго, што мы ў сябя маем. Нам вядомы ўсе звяры, што жывуць на Беларусі (іх не шмат, і за імі лягчэй назіраць), усе птушкі і рыбы. Выдадзены вызначальнікі, манаграфіі, даведнікі. З насякомымі значна складаней. Па-першае, іх намнога болей. Па-другое, існуюць іншыя акалічнасці: дробныя памеры, скрытнае жыццё насякомых. І вельмі істотная прычына — недастатковасць спецыялістаў. Я і мае аднадумцы імкнемся ліквідаваць гэты прабел. На гэта арыентуем нашых студэнтаў, іншых спецыялістаў і проста дылетантаў, якія цікавяцца энтамафаунай Беларусі. Збіраецца і апрацоўваецца матэрыял, вядуцца назіранні ў прыродзе. Мы супрацоўнічаем з замежнымі спецыялістамі: венграмі, славакамі, французамі, амерыканцамі, японцамі. Іх таксама цікавіць наша фауна. У выніку гэтых кантактаў рыхтуюцца новыя спецыялісты, выдаюцца зборнікі. Зараз я трымаю ў руках адзін з першых нашых зборнікаў, які быў выдадзены ў 1991 годзе. Будзем спадзявацца, што Беларусь будзе ў хуткім часе мець кадастр відаў.

**— Ігар Канстанцінавіч, можна крыху аб сабе...**

— Нарадзіўся я ў 1923 годзе. Цікавасць да біялогіі ўзнікла яшчэ ў школе. Мая маці была біёлагам. Скончыў біялагічны факультэт Харкаўскага універсітэта. Вучыўся ў вельмі вядомых прафесароў. Адным з іх быў С. І. Мядзведзеў — прафесар з еўрапейскай вядомасцю, які ў значнай ступені паўплываў на мой далейшы лёс. Доўгі час я працаваў на Украіне. Там скончыў аспірантуру, абараніў кандыдацкую дысертацыю. Працаваў у Адэскім універсітэце. Потым надоўга перабраўся ў Сярэднюю Азію. Працаваў ва універсітэце Таджыкістана. Зрабіў шмат публікацый, а на сабраным матэрыяле выдаў кнігу, якая была перакладзена на англійскую мову. У 70-ым годзе А. Н. Сеўчанка, чыім імем названа прэмія, запрасіў мяне на Беларусь. Тут я выдаў два падручнікі: «Заагеаграфія» і «Агульная заалогія». Зараз друкуюся, збіраю матэрыял і спадзяюся, што карысны цэламу пакаленню маладых энтамолагаў. Вынікам усёй маёй працы сталі (уключаючы манаграфіі і падручнікі) каля 170 публікацый. Палова з іх выдадзена за мяжой. Друкаваўся ў часопісах Швейцарыі, Германіі, Італіі, Чэхаславакіі і г.д. З'яўляюся пастаянным членам аргкамітэтаў аўтарытэтных міжнародных сімпозіумаў па вывучэнню энтамафауны Цэнтральнай Еўропы. У свой час быў прадстаўніком СССР, цяпер — Беларусі. Ганаруся, што беларускія энтамолагі працуюць на сучасным еўрапейскім узроўні.

**— Яшчэ раз віншуем Вас з атрыманнем прэміі і жадаем плёну ў вашай працы. Дзякуй за размову.**

**Гутарку вёў**
**Юрась КАРМАНАЎ.**

**На фотаздымку: прафесар І. К. Лапацін.**

# УЛАДЗІМІР КОШАЛЕЎ:
## «МАЕ ВЕДЫ НОСЯЦЬ ПАКУЛЬ АКАДЭМІЧНЫ ХАРАКТАР».

***У гэтым годзе лаўрэатам новай прэміі імя У. І. Пічэты стаў загадчык кафедры Новай і Навейшай гісторыі БДУ прафесар У. С. Кошалеў, з якім і сустрэўся карэспандэнт «Беларускага універсітэта».***

**— Уладзімір Сяргеевіч, раскажыце, калі ласка, што ўяўляе сабой прэмія імя Пічэты, каму яна прысуджаецца і за што?**

— Гэта прэмія прысуджаецца ў рамках БДУ за грунтоўныя работы ў сферы гуманітарных навук. Мне яна была прысуджана за цыкл работ па сацыяльна-палітычнай гісторыі адной з буйнейшых краін Арабскага Усходу — Егіпту. Я б дадаў, што распрацоўка вялася па гісторыі Новага і Навейшага часу. Гэта практычна ўсё XIX і XX стагоддзі. Сваімі манаграфіямі я ахапіў гісторыю гэтай краіны ў сукупнасці ўсіх асноўных праблем, якімі жыла гэтая краіна. Адна з састаўляючых майго даследавання — праблема мадэрнізацыі Егіпту, як і любой іншай краіны Усходу, ад стану сярэднявечча да сучаснасці. Гэта праблема суаднасін традыцыйнага і сучаснага. Трэба было паказаць пранікненне навукова-тэхнічных еўрапейскіх дасягненняў, палітычнай культуры і трансфармацыю традыцыйнага ўсходняга грамадства. Сучасныя формы палітычнай барацьбы: палітычныя партыі і арганізацыі сфарміраваліся на Усходзе толькі ў другой палове XIX ст. Дагэтуль гісторыя краін Усходу не ведала гэтых традыцыйных для Еўропы сацыяльных формаў палітычнай арганізацыі. Пачала з'яўляцца інтэлігенцыя, якая глядзела на свет не праз прызму іслама і рэлігійных уяўленняў, а праз веды, якія інтэлігенцыя атрымала ад Заходняй Еўропы.

**— А якім чынам ішло пранікненне заходняй культуры ў краіны Усходу, у прыватнасці ў Егіпет?**

— Праз кантакты. Краіны Усходу адчувалі сваю адсталасць у развіцці тэхнікі і навукі ў параўнанні з Еўропай. Таму ішоў працэс запазычання гэтых дасягненняў. Такім чынам, апрыорна, мела месца перайманне нейкіх павярхоўных каштоўнасцей. Наогул жа, можна прасачыць два каналы сувязі з Еўропай. Першы — непасрэдныя кантакты, навучанне, падарожжы па краінах Еўропы. І другі — самі еўрапейцы імкнуліся прыжыцца ва ўсходнім грамадстве. Тут і дзейнасць італьянскіх рэвалюцыянераў, якія вымушаны былі ратавацца ад праследванняў уладаў у Егіпце, тут і еўрапейская абшчына, і масонскія арганізацыі, у склад якіх уваходзілі прадстаўнікі егіпецкай палітычнай эліты (але матэрыялаў па гэтаму пытанню, на жаль, вельмі мала) і г.д. Працэсы мадэрнізацыі Усходу ідуць і зараз.

**— Уладзімір Сяргеевіч, якія яшчэ праблемы ўздымаліся ў вашай навуковай працы?**

— Гэта вытворная ад вялікай праблемы. Тэма, якая разглядае генезіс партыйнай сістэмы ў Егіпце. Гэта фарміраванне палітычных партый і арганізацый, іх станаўленне з другой паловы XIX ст. да сучаснага часу. Яшчэ адна праблема — формы антыкаланіяльнага супраціўлення. Егіпет з 1882 па 1952 быў акупіраваны Англіяй, фактычна з'яўляўся калоніяй. Формы залежнасці змяніліся, але англійскія войскі прысутнічалі ў гэтай усходняй краіне заўсёды. У Егіпце развіваўся нацыянальна-вызваленчы рух. Я спрабаваў даследаваць як легальныя структуры гэтага руху, так і нелегальныя. Гэтая тэма з'яўлялася ў сусветнай даследчай літаратуры. у цэлым, «Тэра інкогніта». І я, з пачуццём годнасці, магу канстатаваць — у маіх працах гэтая тэма знайшла адлюстраванне. Паралельна я разглядаю фарміраванне ісламскіх ультранацыяналістычных арганізацый. Мной даследуецца і генезіс партыйнай сістэмы ў двух накірунках. Нават калі б Егіпет не быў акупіраваны і не стаялі праблемы нацыянальнага вызвалення краіны, то ўсё роўна фарміравалася б сістэма партый. З'яўляліся новыя сацыяльныя групы і класы буржуазнага характару. Іх інтарэсы неяк кансалідаваліся ў барацьбе, скажам, супраць засілля ўсходняга дыспатызму. Але працэс фарміравання партыйнай сістэмы быў яшчэ больш абвостраны праблемамі нацыянальна-вызваленчага руху. Вельмі цяжка размежаваць: дзе ўласна палітычная партыя, а дзе арганізацыя вызваленчага характару. Любая партыя Егіпта, фарміруючы сваю праграму, абавязкова выказвала стаўленне да праблемы знаходжання ў Егіпце англічан. Гэта і арганізацыі, што мелі дачыненне да каралеўскага двара, і партыі празаходняга накірунку.

**— Уладзімір Сяргеевіч, у чым, на ваш погляд, прычына цяперашняга становішча з тэрарызмам на Усходзе. Ці не трэба шукаць яго вытокі ў гісторыі?**

— Тайныя арганізацыі Егіпта былі прыхільнікамі адкрыта тэрарыстычных формаў барацьбы. У сваіх навуковых даследваннях я даю ацэнку гэтым формам. Вельмі часта тэрор адмоўна адбіваўся на развіцці нацыянальна-вызваленчага руху. Але, як кажуць, з песні слова не выкінеш. Скажам,



такая партыя, як ВАФД (партыя празаходняй арыентацыі), што існавала на пачатку XX ст. і прадстаўляла інтарэсы егіпецкай буржуазіі, выступіла супраць англічан з лозунгам барацьбы за нацыянальнае вызваленне. З 1919 па 1924 гэтая партыя мела свае падпольныя арганізацыі. Яшчэ адна радыкальная партыя — Нацыянальная — таксама рашуча выступала супраць англічан і стварала падпольныя структуры. Трэба ўзгадаць арганізацыі ісламскага характару, якія найбольш праявілі сябе ў 20—30 гады. Пазней ахвярай адной з такіх арганізацый стаў прэзідэнт Анварас Садат.

Працуючы над гэтай тэмай, тэмай тэрарызму, я сутыкнуўся з рознымі падыходамі ў англійскай, германскай, савецкай літаратуры. І, мне здаецца, што тэрарызм можна растлумачыць і часткова зразумець. Ён быў рэакцыяй грамадства на тыя працэсы, якія адбываліся ў Егіпце.

**— Якімі крыніцамі вы карысталіся пры рабоце над гэтай тэмай?**

— У кнізе, выдадзенай па матэрыялах доктарскай дысертацыі, я называю каля 800 крыніц інфармацыі на арабскай, рускай. англійскай, нямецкай, французскай, італьянскай мовах. Я імкнуўся ўлічыць усю сусветную гісторыяграфію па Новай і Навейшай гісторыі. Вялікую карысць мне прынесла стажыроўка ў Егіпце ў 1971 — 1972 годзе. Я працаваў у архівах, у цэнтрах, аб якіх доўгі час нават не мог марыць. Я пазнаёміўся з вядучымі гісторыкамі гэтай краіны.

**— А цяпер, калі ласка, раскажыце аб сабе.**

— Я закончыў гістарычны факультэт БДУ. Два гады вучыўся ў інстытуце усходніх моў (зараз інстытут краін Азіі і Афрыкі), вывучаў арабскую мову і спецыялізаваўся па Новай і Навейшай гісторыі арабскіх краін. У 1971—1972 стажыроўка ў Егіпце: праца над мовай і збіранне матэрыяла для кандыдацкай і, як аказалася, для доктарскай. З 1970 працую на гістарычным факультэце БДУ. Прайшоў увесь шлях ад выкладчыка да прафесара. Кандыдацкую і доктарскую дысертацыі абараняў у Маскве. Зараз — доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедрай Новай і Навейшай гісторыі. Працаваў у ААН. За гэты час здолеў пазнаёміцца з краінамі арабскага Усходу: Іракам, Сірыяй, Алжырам, Егіптам і з еўрапейскімі краінамі таксама. У 1990 годзе была зроблена спроба ўсталяваць навуковыя кантакты і разам працаваць над агульнай праграмай з гісторыкамі Дамаскага універсітэта па тэме «Гісторыя кантактаў паміж Расіяй і арабскімі краінамі». На жаль, гэтая спроба не была ўдалай.

**— Уладзімір Сяргеевіч, ці знаходзяць вашыя грунтоўныя веды і вялікі практычны вопыт прымяненне ў знешняй палітыцы Беларусі, як самастойнай дзяржавы? Ці паступалі да вас прапановы аб супрацоўніцтве ад Міністэрства замежных спраў РБ?**

— На вялікі жаль — не. Такіх прапаноў не было. Але я да гэтага стаўлюся даволі спакойна. Я разумею рэаліі сённяшняга палітычнага жыцця. Але ж Арабскі Усход мог даць Беларусі не менш, чым Ізраіль, з якім сёння ўжо ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны. Зараз мае веды носяць чыста акадэмічны характар і прыкладаюцца ў сферы зносін са студэнтамі, у маіх навуковых працах і, чым я асабліва ганаруся,— у напісанні падручнікаў для сярэдняй школы. А ў перспектыве — і ў стварэнні вучэбнай літаратуры для студэнтаў.

Гутарку вёў
Юрась КАРМАНАЎ.

**На фотаздымку: прафесар У. С. Кошалеў.**

# СВЯТ-КУ-ЕМ!

**Як паведамілі карэспандэнту «Беларускага універсітэта» у Беларускім таварыстве дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі, 25 снежня і 7 студзеня ў Мінску будуць ладзіцца святкаванні калядаў адпаведна каталіцкай і праваслаўнай канфесій.**

**Святкаванні адбудуцца згодна з планам гарадскіх мерапрыемстваў Мінгарвыканкама. У праграме каталіцкага Свята—Набажэнства ў касцёле Святога Роха, арганны канцэрт, выступленні студэнцкіх тэатраў-масак, батлейкавыя прадстаўленні, фальклорныя калектывы, святочныя кірмашы, студэнцкія гульні ў цэнтральным дзіцячым парку імя Горкага.**

**Юрась КАРМАНАЎ.**



ЯКРАЗ ДЛЯ ВАС

## ОЙ, КАЛЯДАЧКІ — СТУДЭНТАМ ЛАДАЧКІ!

*Студэнскі клуб Белдзяржуніверсітэта, маладзёжны цэнтр БДУ, інфармацыйна-культурны цэнтр Саўміна запрашае вас на свята. Адзін пералік фундатараў, якія яго ладзяць, павінен выклікаць у вас імпэт. Тым больш, што ў праграме свята калядныя скокі, падарункі, прызы і, зразумела, сэрца каханага чалавека, якога вы абавязкова стрэнеце тут. Дзе? На вуліцы Кастрычніцкай, 5. Калі? 24 снежня ў 19 гадзін. Дзе дастаць білеты?? У аўдыторыі 401 галаўнага корпусу БДУ. Спяшайцеся, і шчасце не прымусіць вас чакаць.*

**Юрась КАРМАНАЎ.**



## «ШПОРА» — ЯНА І Ў СПАРЦЕ «ШПОРА»

*Не сёння, дык заўтра ў студэнтаў пачнуцца экзамены. Нязменны атрыбут падрыхтоўкі да іх — напісанне шпаргалак. Магчыма, не ўсім вядома, што шпаргалка — вынаходніцтва не савецкіх студэнтаў, хаця засвоілі яны гэтую навуку лепш за іншых...*

*Неяк рускі пісьменнік Аркадзь Аверчанка апублікаваў у «Сатырыконе» матэрыял пра шпаргалкі, дзе расказаў пра паходжанне «навуковага дапаможніка» і пра тое, як рыхтавалі «шпоры» ў яго ны час. Змяшчаем з невялікімі скарачэннямі гэты артыкул. Спадзяемся, што студэнтам парады пойдуць на карысць...*

### ПРА ШПАРГАЛКУ

**(трактат).**

«Шпаргалка» прыйшла да нас з даўніны. Гэтае слова ў перакладзе з санскрыцкай мовы азначае «сакрэтны, тайны дакумент».

У Плінія сустракаецца апісанне шпаргалак таго часу. Былі яны вялізныя, нязручныя і ўжываліся старажытнымі вучнямі толькі ў надзвычайных выпадках.

Справа ў тым, што папера тады яшчэ не існавала, а папірус і выробленая скура жывёл каштавала вельмі дорага. Таму шпаргалкі пісаліся вучнямі на нехлямяжных, цяжкіх цэглінах, якія маглі быць схаванымі ў кішэні альбо за пазухай. Тыя, хто карыстаўся на экзамене такімі шпаргалкамі, часцяком пападаліся, падвяргаліся спагнанню.

З часу вынаходніцтва паперы шпаргалка пачала распаўсюджвацца, развівацца і праз пэўны час заваявала сабе ў навуцы неблагое становішча. Але дзеці, карыстаючыся шпаргалкай, як і ў старажытныя часы, усяляк караліся і нават выклікалі гэтым знакаміты па сваёй жорсткасці закон Мальтуса.

Аднак навука не пазяхала і хутка крочыла наперад, штурхаючы наперад зручную і партатыўную шпаргалку. Некаторыя абаронцы шпаргалкі, як навуковага дапаможніка, сцвярджалі нават, што не навука развівала шпаргалку, а шпаргалка цягнула за сабой навуку.

Ва ўсялякім выпадку вядома, што і вялікія, знакамітыя людзі не грэбавалі шпаргалкай. Вось некаторыя з іх: Гейне, Гельмгольц і нават наш вялікі суайчыннік Пушкін, аўтар неўміручай паэмы «Руслан і Людміла»...

У наш час шпаргалка з'яўляецца ўзорам дасканаласці, хітрасці і чалавечай вынаходлівасці. У яе падрыхтоўцы шмат чаго спрасцілася. Усё непатрэбнае, якое раней прымушала вучняў рызыкаваць, — ліквідавалася.

Пералічым у нашым невялікім нарысе найбольш распаўсюджаныя тыпы шпаргалак.

### ШПАРГАЛКА ЗВЫЧАЙНАЯ

Пішацца на доўгай, скручанай у трубку паперы, накшталт старажытнага світка. Папера згорнута так, каб яе краі загіналіся ў сярэдзіну, і такім чынам, патрэбнае месца можа быць знойдзена ў бясконцым світку шляхам перамяшчэння загнутых краёў. Почырк павінен быць дробным, але разборлівым, без памылак.

### ШПАРГАЛКА МАНЖЭТНАЯ

Лепшы спосаб карыстання манжэтнай шпаргалкай — задуменнае паднясенне рукі да ілба, быццам вы засяроджана абдумваеце адказ. За гэты час і трэба хутка прачытаць шпаргалку...

Калі вас выкрылі, вы павінны імгненна схаваць манжэты ў рукавы, а калі і гэта будзе заўважана, можаце выкарыстаць апошні шанц — здзіўлена заявіце, што самі не ведаеце, каму спатрэбілася сапсаваць вашыя новыя манжэты, ісцісаўшы іх незразумелымі словамі.



### ШПАРГАЛКА ПАДЭШВЕННАЯ

Культура хутка крочыць наперад. Што здавалася немагчымым учора — сёння ўжо не выклікае не ў каго здзіўлення. Гэта датычыцца і падэшвеннай шпаргалкі...

Зразумела, што само месца знаходжання шпаргалкі звужае кола магчымасцей карыстання ёю. Пры вусным адказе чытанне такой шпаргалкі немагчыма. Мы не ведаем такіх выпадкаў, калі б хто-небудзь, стоячы перад экзаменатарам, схапіў сябе за нагу, паднёс падэшву бота да вачэй і пачаў адказваць па ёй свой білет. Акрамя нязручнасці гэтага становішча, яно адразу кідаецца ў вочы экзаменатараў і выклікае ў іх падазронасць: што гэта вучань знайшоў на сваім боце? чаму ён так пільна разглядае сваю падэшву?

### ШПАРГАЛКА З ГУМАЙ

Выраб такі: кавалак гумы, якая звычайна ўжываецца для вырабу рагатак, прышываецца адным канцом да ўнутранай кішэні, а другім — да шпаргалкі. Яе трэба зрабіць з цвёрдай паперы.

Шпаргалка выцягваецца з кішэні і хутка прачытваецца. У выпадку пагрозы дастаткова толькі адпусціць шпаргалку — яна сама знойдзе кішэню. Пры сутыкненнях з экзаменацыйнай камісіяй трэба рабіць выгляд нявінна пакрыўджанага. Аднак пасля атрымання добрай адзнакі не рэкамендуем выкрываць фокус з гумай. Хвіліна задавальнення ад перамогі над выкладчыкам можа ператварыцца ў паўторны год навучання.

### ШПАРГАЛКА ЦЯЛЕСНАЯ

Ужо сама назва гэтай шпаргалкі дае знаць, дзе яна павінна пісацца. Найбольш зручныя для гэтага месца — далоні і ногці. Аднак гэты спосаб нязручны тым, што пазбаўляе вучня магчымасці вітацца з сябрамі, выцерці пот з ілба альбо ўступіць у драку з аднагодкамі. Мы ведалі хлапчука, якога сябры перад экзаменам білі і абражалі, як хацелі, а ён адказваў на ўсё гэта паблажлівай усмешкай. І не таму, што быў ён добрым, а проста рукі былі ў яго спісанымі. Нават на нагцях былі нейкія формулы. Гэты хлопчык бліскуча вытрымаў экзамен, але калі пайшоў потым выціраць свае запісы на руках з дапамогай твараў і патыліц былых крыўдзіцеляў, то настолькі захапіўся, што быў заўважаны наглядальнікамі агругі і пакінуты на другі год.

* * *

Артыкул пра шпаргалкі закончаны.

Некаторыя педагогі, магчыма, папракнуць нас тым, што мы ўвесь час трымаліся толькі на ўзроўні шпаргалкі і яе выкарыстання замест таго, каб параіць вучням добрасумленна рыхтавацца па кнігах. Але справа ў тым, што «Сатырыкон» — свядомы праціўнік экзаменаў.

НА МЯЖЫ

## ЦЯЖКІ ЎЗРОСТ

Здаецца, мы дасягнулі праславутага дна.

...Чацвёра юнакоў «абчысцілі» на восемдзесят рублёў п'янага, які ляжаў у пад'ездзе, а потым вырашылі пакуражыцца над ім і падпалілі адзенне. Ад апёкаў той сканаў.

... Трое непаўналетніх, двум не было і чатырнаццаці, здзейснілі акт насілля ў адносінах да пяцігадовага малыша, затым па-зверску забілі яго каменнямі.

...Дзевяцікласнік і беспрацоўны нападаюць на вартавога, адымаюць аўтамат, каб прадаць за паўтара мільёна.

...Вучаніца дапамагае гвалтаваць сваіх сяброўак... А для храбрасці часта ўжывае спіртное.

...Дзесяцігадовы хлопчык скача па грудзях малыша, каб паглядзець, як той будзе паміраць.

Гэта некалькі радкоў з архіва маёй сяброўкі-студэнткі, якая збірае артыкулы на падобныя тэмы. І хаця адрасы пад публікацыямі знаёмыя — гарады і вёскі Беларусі — свядомасць адмаўляецца верыць у рэальнасць гэтых падзей. Шакіруе нянавісць, якую праяўляюць непаўналетнія злачынцы да сваіх равеснікаў, дарослых і ўсяго, што іх акружае. Дарослым нібы аб'яўлена вайна, але мне здаецца, гэта толькі палявыя вучэнні. Вайна пачнецца, калі гэтыя дзеці самі стануць дарослымі.

Дзе ж тая мяжа, пераступіўшы якую чалавек робіцца злачынцам, наколькі блізка да яе падышлі падлеткі? Адказ на гэтае пытанне я паспрабавала знайсці ў адным з «сярэдніх» класаў, адной з «сярэдніх» школ. Узрост вучняў — 14—15 гадоў. Настаўнікі скардзяцца на паспяховасць не больш, чым у іншых класах.

На пытанне «Калі мне было балюча?» школьнікі адказалі па-рознаму. Адным было балюча за «несправядлівасць у адносінах да старых, інвалідаў», другім — «ад нашых жа адносін адзін да аднаго», трэцім — за «экалогію і людзей, якія пацярпелі ад выбуху на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі», чацвёртым «калі іх кінуў каханы», пятым — ад узаеманепаразумення з бацькамі.

— ...Яна невялікага росту. За гэта яе не любяць хлопцы і дзяўчаты нашага класа, — чытаю я ў адным з адказаў, — зняважаюць і тузаюць за яе доўгую касу. А дзве нашыя аднакласніцы вырашылі пабіць яе. Ні за што. У туалеце яны накінуліся на маю сяброўку і пачалі біць. Я пачула крыкі і пабегла на дапамогу. Сяброўку я выратавала, але дзяўчаты ўдарылі мяне. Раз... другі.. трэці. Мне ўдалося іх адштурхнуць і ўцячы... А потым яны выхваляліся сваім «подзвігам» і казалі, што заб'юць маю сяброўку за тое, што я ёй дапамагала. Але ў класе ім ніхто не паверыў.



Мы прызвычаіліся да насілля. Мы — дарослыя. У Абхазіі, Карабаху, Таджыкістане забіты яшчэ не апошні чалавек. У Беларусі пачынае адбывацца нешта падобнае. Уздыхаем: што зробіш — жыццё такое. Балючы парог даўно пройдзены.

Але калі так — чаму ж здзіўляцца, што ён пройдзены і ў падлеткаў? І ў дзяцей. У рэспубліцы на дзесяць тысяч дарослых прыпадае 28 злачынцаў — малалетніх, ва ўзросце 14—17 гадоў, — 66. Расце злачыннасць сярод дзяўчат.

Злачыннасць, як страшэнная хвароба, распаўсюджваецца на здаровыя органы, якія яшчэ нядаўна аказвалі супрціўленне. Дзеці, што бачылі несправядлівасць у адносінах да сябе, самі становяцца несправядлівымі да іншых.

— Мы ездзілі на спаборніцтвы і заўсёды старэйшыя хлопцы адымалі ў нас ежу, грошы. Калі я падрос, зразумеў, што без гэтага нельга, інакш страціш сябе ў вачах таварышаў.

Я не ведаю, якія таварышы ў аўтара адказа, але паняцце годнасці яны пераблыталі з паняццем подласці. А можа не пераблыталі, а зусім знішчылі? За апошні час дарослыя разбурылі ўсё, што толькі можна было разбурыць. У тым ліку і ў адносінах да дзяцей і падлеткаў. Ці трэба пасля гэтага здзіўляцца і высакародна абурацца? Было ж нейкае выхаванне, былі ідэі, прыклады. Быў у рэшце рэшт камсамол. Зараз і гэтага няма. Па сутнасці, дзеці сталі нікому непатрэбныя.

— ...Калі я быў паменш, вельмі любіў пакурыць Аднойчы я ішоў па вуліцы, а насустрач — здаровы мужык. Я падыходжу і кажу: «Мужык, а мужык, дай закурыць». Але мужчына быў не з баязлівых і адказвае паблатному: «Малы яшчэ». Я дастаў «пяро» і растлумачыў: «Мужык, калі не дасі цыгарэту, не сустрэнеш заўтра світанне, а бацькі прыйдуць і ўбачаць тваю галаву на тумбачцы, тулава — на канапе». Мужык спалохаўся і ўцёк. Мне стала балюча ў душы не за мужыка, а за тое, што тут сустракаюцца такія «псы», бо «пяро» было гумавае. Я вельмі перажываў з-за гэтага, нават не еў.

Прызнаюся, гэты адказ уразіў мяне больш за астатнія.

Мы страцілі свае ідэалы, падлеткі згубілі сваіх герояў. Зараз паважаюць тых, хто мацнейшы, хто не лічыцца з пачуццямі і жаданнямі іншых. Падштурхоўваюць да мяжы, за якой падлетак становіцца злачынцам і праблемы больш «зямныя» — куды ісці працаваць, як арганізаваць вольны час. Большасць секцый і гурткоў сталі высокаплатнымі. Рынак кінуў маладое пакаленне ў бездань.

Сацыяльны партрэт злачынца-падлетка даволі разнародны. Кожны трэці падлетак, з ліку злачынцаў, пражываў ці пражывае ў сям'і, дзе ёсць хтось раней судзімы, кожны другі — ў няпоўнай сям'і.

У гэтым годзе адбылася нарада кіраўнікоў праваахоўчых органаў па пытаннях барацьбы са злачыннасцю. У кулуарах гэтай нарады нехта з удзельнікаў пажартаваў: «Гавораць, у Лацінскай Амерыцы дзевяць з дзесяці платных забойцаў — непаўналетнія. Нам іх яшчэ даганяць і даганяць». Удзельнікі, што стаялі побач засмяяліся.

Я думаю — даганяць. А мы не адстанем. І тады — «абхахочымся».

**Наталля КРЫШТОПЕНКА.**

# МАЙСТРОЎНЯ



— Я люблю думаць. Толькі не трэба есці... Калі думаеш і ясі — гэта пошла...

— Аб чым думаць?

— Аб усім. Гэта стан такі — думаць...

А яшчэ Віктар любіць паразмаўляць. І ў гэтым стане ён можа знаходзіцца бясконца, пакуль не спыніш.

Ён вучыцца ў БДПА. Шчыра кажучы, я ніколі не думала, што ў Палітэхнічнай Акадэміі ёсць творчыя людзі. А аказалася — іх там цэлы факультэт. Архітэктурны. Студэнты-архітэктары спраўна вучацца, робяць класныя праекты і фантастычныя замалёўкі, якім ніколі не суджана набыць рэальнага жыцця. Але яны ўсё ж такі ствараюць, рызыкуюць, спрачаюцца з выкладчыкамі і пішуць вершы.

Віктар ніколі не спрабаваў друкаваць сваіх вершаў. Гэта, на яго думку, настолькі асабістае, што нікому не патрэбна. «Я сам, калі бачу вершы ў газеце, ніколі іх не чытаю. Навошта яны мне? Чужыя вершы? Не варта...»

Сам піша таму, што вершы да яго прыходзяць. Не збянтэжваецца, калі яны не зразумелы іншым. І тлумачыць іх не бярэцца.

*Не будзем рабіць гэтага і мы. Але, здаецца, у гэтых вершах бачыцца наша пакаленне «завёрнутае» на разнастайных дзіўнасцях і нежаданні быць зразумелым усімі.*

## Віктар КАХРАМАН

### ЧАЙКА

**Она летела над полем, там еще стоит маленький домик с лестницей и какая-то установка, напоминающая две толстенные, длиннющие трубы. Это произошло с западной стороны д. Малинники, возле одинокой асфальтной дороги. Было очень жарко. Начало июля 1992 года.**

Я сегодня проснулся и вспомнил о чайке,
Так прекрасно парившей в середине дня,
Вспомнил даль, уводящую к верным цветам и травам,
Вспомнил слепящий асфальт и бескрайние поля,
Что пройти было лень, не напившись воды из колодца.
Доставая ведро и в зеркальной воде
обнаружив себя,
Проливал через край, не поспев и подумать о сути,
Лишь потом только вспомнив от зимнего солнца
Улетавшую чайку в сверкании дня навсегда.

### ВРЕМЯ

Будем время, бородатае время долин:
Выйдешь из дома, окажешься в темной избе,
Повернешься к дверям и увидишь окно в сундуке,
Кинешь в топку дрова, а окажется — зерна любви,
Можно выйти, и дверь распахнется сама,
Оглянешься, и лес окружен голубым,
Глянешь вниз и увидишь себя на траве,
Руки к небу — и словишь коня.

### ДЫМ МАРИХУАНЫ

***Когда увидел на Свислочи Свету и Лёху накурившимися марихуаны в компании незнакомцев***

Он холодильник
Повесил на стул
И трубку как гвоздь
В рот затолкнул.
В вечернем поезде
Встречных огней
Понятия клетки
Сливались в ней.
В моментах блаженства,
Незримых красот.
О, призрачный дым!
О, призрачный бог!
Воскликнуло утро
В палящих лучах.
А он ее ждал
И думал о ней
По-прежнему с лаской
И вечной тоской.
Тоскливая песнь.
Будь он князь молодой...
В сандалях песок,
На плечах небеса,
За каждым шагом
Плетется она...
И водятся кругом,
И прядки вершат.
О, дым табакерки!
О, маковый брат!
Она была феей,
Долгожданной мечтой,
Невестой волшебной,
Будь он принц молодой.
И в свете лучей
Таких необычных
Он растворялся
В деревьях и травах.
И был погружаем в
В созерцанье прибоя,
Прилива, рождения пчел.
Насколько хватало
Сносил это всё,
И вновь вырываем
С объятий чудес
На стену обычности
В отчаяньи лез.

### ОСЕННИЕ МОТИВЫ

Какие странные и непонятные слова —
Смотреть на осень сквозь окно трамвая,
По рельсам стука проезжая
Листвой покрытые дома.
И радость фонарей как иноки склоненных
Ловить дорожною петлёй,
И почерком дождя, шарфом ночи воспламенённым,
Водить по струнам флейты скользкою слезой.
И озираться на сиденья
Скрежещей тишины,
Оставив на тысячу мгновений
Входящие гармошкою цветастые зонты.
Зонты-цветы, за ними взгляды,
Как бабочки открытые глаза,
Морганьем мерным полные услады
От серого, бренчаньем звонкого дождя.
Так осень входит
саркастической улыбкой
Смеясь, похлопывая дрожью по ногам,
Рисунком сущности своей не зыбкой,
Даря порыв свой летний зимним холодам.



### НА РОЖДЕСТВО

**Собрались вот мы, Господь,**
**Кто смог на продрог,**
**А кто не смог,**
**Те уж в дорогах.**
**Деревья за окнами улыбаются,**
**Ветками склоняются.**
**А мы собрались,**
**Хлебом припаслись,**
**Да самогон гоним,**
**Да свеча из печи,**
**Яблочко по тарелочке**
**Так уж вертится.**
**То гадаем, играем,**
**Кости бросаем.**
**В гости не заходим —**
**Сами гости.**
**Что предложат, то отложим,**
**Несерьезные ведь рожи,**
**Шутовство одно:**
**Пляски, вилки-пилки,**
**Зубы как точилки.**
**Пасмурна зима,**
**Пыль гоняет, прижимает.**
**Эх, старуха, всё с лица!**
**Только мы чего-то ждём,—**
**Человечая мечта,**
**Плюс надежда, как всегда.**
**И живём,**
**И хлеб жуём.**
**Корочка всё твёрже.**
**Ждём!**
**Сегодня собрались.**
**Ждём, Господь,**
**Тебя как прежде.**
**Звездочкою припаслись**
**Из фольги конфетной.**
**Как блестит она елово**
**Новогодней ёлкой**
**Под огонь свечи-печи,**
**Из которой вынимаем колочи.**
**калачи.**
**Ты подуй, попробуй.**
**Хороши, что не скажи.**
**Под огонь свечи-печи**
**Замелькают ковы,**
**То не совы и не птицы,**
**И не палки в спицы.**
**То звезды концы-страницы,**
**Что читали и читаем,**
**Что узнали, что бывало,**
**Что прошло и будет снова,**
**Снова только ново,**
**Не покинет Слово нас**
**В этот час.**
**Где вино и стол накрыты,**
**Где хлеба и мы не сшиты,**
**Как раскрыты — не зашиты,**
**Ждём тебя, Господь, сегодня**
**С звездочкой не в первый раз.**

### Ж/Д

Железная дорога
Умеет смеяться в жару
В оранжевых кофтах
Проходчика шпал
Кидающих зебру
На фланельную фольгу
С банок шпрот
Кабачковой икры
И босоноженных каблуков
Кувалдного костыля
Рожденного ритмом
Артиллерийской пальбы
Крутящейся веером
Счета колёс
Выбритых галькой
Щебенки морской
Разложенной вдоль
Замученной рельсы
Вспотевшей на солнце
Дрезиной курорта
Торгующего недрами
Подбикининой красоты
Сверкание пляжа
Рококочащей мазутни
Лазуревых фонарей
Наводят на станции
Женской походки
В вечернем восходе
Дребежащей пчелы
Котрастирующих кораблей.

### МУХА

**Медленно медленно**
**медленно медленно**
**медленно катится**
**Катится катится**
**катится зимняя муха**
**В весеннее брюхо.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, 1-ы Загарадны зав., 3.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

24 снежня
Зак. 1712.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.*

Рэдактар
Т. М. КАЗАК.